*Настаўнік прапануе*

# ВОБРАЗЫ СЫМОНА І ГАННЫ Ў ПАЭМЕ "СЫМОН-МУЗЫКА" ЯКУБА КОЛАСА

## УРОК БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ (X КЛАС)

**Мэта ўрока:** прасачыць за эвалюцыяй характару Сымона; звярнуць увагу на тыповасць вобраза мастака; развіваць навыкі вобразнага аналізу; выхоўваць павагу да скарбаў беларускай літаратуры, дапамагчы адчуць сябе гарманічна развітай асобай.

**Эпіграф:**

Добра быць коласам; але шчасліў той, каму давялося быць васільком. Бо нашто каласы, калі няма васількоў?

М. Багдановіч. Апокрыф.

Жыві і цэльнасці шукай, аб шыраце духоўнай дбай.

М. Багдановіч.

### ХОД УРОКА

**I. Арганізацыйны момант.**

• ***Слова настаўніка.***

Вось малюнак ранняй восені:

Час падходзіў за Пакровы,
Вецер ліст з лясоў атрос,
І на поле свае ковы
Кінуў злёганьку мароз.
Восень ткала ўжо красёнцы
Мяккай чырвані ў лістах,
Восень спеў вяла бясконцы,
З ветрам ходзячы ў кустах;
Восень прала кужаль тонкі –
Павуціння белы лён;
Восень шэрыя заслонкі
Моўчкі клала пад адхон.

Гэтыя радкі з апісаннем восені з паэмы "Сымон-музыка" Якуба Коласа залатымі старонкамі ўвайшлі ў беларускую паэзію. Сёння на ўроку мы будзем працягваць размову пра паэму "Сымон-музыка", паспрабуем даць свае адказы на пытанні, што паставіў Якуб Колас у творы: якія дарогі павінен прайсці таленавіты чалавек, каб жыць у гармоніі з сабой і навакольным светам?

**II. Аналіз тэксту паэмы і асэнсаванне яго вучнямі.**

• ***Работа з эпіграфам.***

Што ёсць колас? Што ёсць васілёк? (*Колас сімвалізуе хлеб, матэрыяльнае жыццё, васілёк – сімвал народнага мастацтва, сімвал красы, Радзімы, духоўнага жыцця.*)

Што важней у жыцці? Гэтае пытанне паўставала перад Я. Коласам, паўстае і перад намі. Для пісьменніка вельмі важна раскрыць вытокі мастацтва, той цудадзейнай сілы, што мае такую вялікую ўладу над людзьмі.

• ***Работа па пытаннях.***

1. Хто ці што паўплывала на абуджэнне таленту ў простага вясковага хлопчыка Сымонкі? (*Вакольныя мясціны: палі, лугі, лясы. Іх непаўторная краса чаравала ўражлівага хлопчыка. Прырода бясконцасцю і загадкавасцю сваіх праяў нарадзіла ў чулай душы хваляванне, абудзіла фантазію, а затым музычны талент.*)

2. Які першы этап абуджэння творчай асобы? (*Хлопчык назірае, любуецца навакольным светам. Тое, што звычайна для іншых людзей, для яго загадкава і чароўна.*) Пацвердзіце радкамі з паэмы. (*Ад роднае зямлі, ад гоману бароў, / Ад казак вечароў, / Ад песень дудароў, / Ад светлых воблікаў закінутых дзяцей, / Ад шолаху начэй, / Ад тысячы ніцей, / З якіх аснована і выткана жыццё / І злучана быццё і небыццё, – / Збіраўся скарб, струменіўся няспынна, / Вясёлкавым ірдзеннем мне спяваў…*)

3. Які другі этап абуджэння таленту? (*Другім этапам у станаўленні таленту будзе работа душы і розуму. Гэты працэс неспазнаны, схаваны ў глыбінях і тайніках душы: І выхаду шукаў / Адбітак родных з'яў / У словах-вобразах, у песнях вольнаплыўных. / І гэты скарб, пазычаны, адбіты, / У сэрцы перажыты / І росамі абмыты. / Як доўг, як дар / Дае пясняр.*)

Узяты ў прыроды скарб, перажыты сэрцам, чалавек-творца вяртае людзям у словах-вобразах, у чароўных гуках, у цудоўных карцінах.

• ***Сувязь мастацкага слова з музыкай.***

*Гучыць скрыпічны эцюд.*

Якім мы бачым Сымона на першым этапе яго жыццёвых блуканняў?

*На дошцы і ў сшытках занатоўваецца шлях духоўнай эвалюцыі Сымона.*

| 1-ы этап духоўнай эвалюцыі |
|---|
| *Любаванне* навакольным светам, *дапытлівасць*, цікаўнасць, *фантазіі*, светлыя дзіцячыя мары, *даверлівасць*, шчырасць, адкрытасць душы |
| Спазнае навакольны свет, законы прыроды |

Да чаго імкнецца хлопчык? (*Спазнаць навакольны свет, законы прыроды.*)

Ці мяняецца ў далейшым характар Сымона? Ці азлабляецца ён? (*Сымон не азлобіўся на ўвесь*

*свет. З заробленымі ў Шлёмы грашыма хоча вярнуцца дадому, не трымае крыўды на бацькоў, бо цяпер ён інакш глядзіць на жыццё, тлумачыць матывы чалавечых учынкаў.)*

Пад уплывам чаго і як мяняецца светапогляд Сымона? (*Пад уплывам тых жыццёвых абставін і людзей, якія сустракаюцца на шляху Сымона.*)

Якім мы бачым Жабрака? (*Жабрак выстаўляе пакуты напаказ, выклікае спагадлівасць, каб назбіраць болей медзякоў. А між тым вучыць Сымона: "Зверам будзь сярод звяроў, між авечачак – ягняткам". Жыццёвая пазіцыя Жабрака – быць хітрым, карыслівым, ашуканцам.*)

Далей на шляху Сымона з'яўляецца яшчэ адна каларытная фігура – Шлёма. Што абяцае Шлёма Сымону? (*Шлёма абяцае салодкае жыццё, падкупляе Сымона бестурботным жыццём, сквапны, выкарыстоўвае талент дзеля прываблівання кліентаў у карчму.*)

Што бачыць дзіця ў карчме? (*П'янства, разбэшчанасць, падман.*)

*На дошцы і ў сшытках занатоўваецца 2-і этап духоўнай эвалюцыі Сымона.*

| 2-і этап духоўнай эвалюцыі Сымона |
|---|
| Спазнанне людской *хітрасці, сквапнасці, крывадушнасці, падману*, разуменне таго, што здольнасці выкарыстоўваюцца з мэтай *нажывы* |
| Спазнае законы чалавечага свету |

Да якой высновы прыходзіць дапытлівы Сымон? (*Спазнае законы чалавечага свету.*)

На жыццёвым шляху Сымон сустракае розных людзей. У паэме ёсць вобраз, што ўвасабляе грубую сілу. Хто гэта? (*Гэта вобраз Князя. Ён увасабленне чэрствасці, усёдазволенасці, абыякавасці, пыхі, жыве лёгка, бесклапотна, з пагардай ставіцца да тых, чыёй працай здабыта яго багацце.*)

Разуменне вялікай несправядлівасці, няроўнасці, багацце адных і галеча іншых, развагі над сацыяльнай няроўнасцю. Да чаго імкнецца няўрымслівая душа юнака? (*Спазнаць гармонію ўнутранага свету і грамадства.*)

*На дошцы і ў сшытках занатоўваецца 3-і этап духоўнай эвалюцыі Сымона.*

| 3-і этап духоўнай эвалюцыі |
|---|
| Разуменне вялікай *несправядлівасці, няроўнасці, багацце* адных і *галеча* іншых, *развагі* над сацыяльнай няроўнасцю |
| Спазнае гармонію ўнутранага свету і грамадства |

Сымон не толькі назірае за светам, ён здольны бачыць і аналізаваць падзеі ў грамадстве, разважае пра сацыяльную няроўнасць і нават кідае гнеўнае абурэнне князю.

Якое пытанне паўстае перад Сымонам у княжым палацы? (*Чаму ў прыродзе гармонія, а ў людскім свеце – здзек, прыніжэнне адных і гультайства, нахабства іншых?*)

Можна сказаць і пра вытокі творчасці, таленту Сымона. Што з'яўляецца такой крыніцай, вытокам? (*Само жыццё, людскі свет з яго болем і радасцю, расчараваннем і надзеяй.*)

Вы заўважылі, што ні з адным чалавекам у Сымона не было поўнага ўзаемапаразумення, гармоніі. Толькі адна душа разумела юнака. Хто яна? (*Ганна.*)

Як уплывае Ганна, пачуцці да яе на развіццё здольнасцей да музыкі? (*Збліжэнне таленавітага хлопца з сардэчнай, шчырай дзяўчынай абвастрае Сымонаў слых і зрок, напаўняе душу і музыку чуласцю да гармоніі навакольнага свету.*)

Здагадайцеся, чым выступае ў творы, па задуме Якуба Коласа, узаемнае каханне шчырай дзяўчыны і таленавітага музыкі? (*Адной з крыніц творчасці.*)

Так, узаемнае каханне выступае той сілай, якая дала Сымонаву таленту крылы, напоўніла гармоніяй, радасцю, адчуваннем бязмежнасці.

**III. Слоўнікавая работа.**

***• Работа з паняццем "гармонія".***

Што абазначае слова *гармонія*? Што гэта такое? (*Вучань зачытвае з "Тлумачальнага слоўніка беларускай літаратурнай мовы" азначэнне паняцця: "Гармонія – зладжанасць, узаемная адпаведнасць у спалучэнні чаго-небудзь".*)

***• Зачытваюцца выказванні славутых людзей, падрыхтаваныя вучнямі.***

***• Работа з ілюстрацыямі.***

**Настаўнік.** Звярніце ўвагу на ілюстрацыі да паэмы, выкананыя вучнямі нашага класа. Якую гармонію назіраем у іх? (*Гармонію фарбаў, колераў, гармонію пачуццяў творцы і адлюстравання іх на палатне.*)

Паглядзіце на вышываныя пано. Яны адлюстроўваюць музыку Сымона і Ганну. Вам падабаецца пано? Ці можна сказаць, што мы бачылі ў ім *гармонію* колераў, святла і ценю? Мы чулі гранне, спевы скрыпкі. Гэта зноў жа гармонія – *гармонія* гукаў.

**IV. Творчасць вучняў.**

Дайце ўласнае азначэнне паняццю *гармонія*.

*Азначэнні вучняў зачытваюцца.*

**V. Падагульненне.**

*Зварот да 2-га эпіграфа.*

**VI. Рэфлексія.**

**VII. Дамашняе заданне.** Вуснае (пісьмовае) сачыненне-разважанне "Каму павінен служыць талент мастака?".

**Наталля ВАСІЛЕНКА,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі
гімназіі № 10 г. Гомеля.

*Аўтар ахвяруе ганарар на развіццё часопіса.*